PFM
POLSKIE FORUM MIGRACYJNE



Rejestracja dziecka cudzoziemskiego urodzonego w Polsce – język białoruski

# Рэгістрацыя замежнага дзіцяці, якое нарадзілася ў Польшчы

Дзіця, якое нарадзілася на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, атрымлівае польскае пасведчанне аб нараджэнні. Аб ім неабходна паведаміць у ЗАГС (USC), адпаведны па месцы нараджэння – праводзіцца раянаванне. Ведамства зарэгіструе нараджэнне дзіцяці і перадасць бацькам яго нумар PESEL, калі хаця б адзін з бацькоў мае такі нумар.

## Калі паведаміць аб нараджэнні дзіцяці?

На працягу 21 дня пасля выдачы карты нараджэння, якую выдае асоба, што прыняла роды (напрыклад, лекар ці акушэрка), а затым (не пазней 3 дзён) перадае ў адпаведнае ведамства. Як правіла, перад выхадам з бальніцы маці атрымлівае запрашэнне з датай візіту і адрасам USC, дзе неабходна зарэгістраваць нованароджанага.
**Калі вы не паведаміце аб нараджэнні дзіцяці ў USC на працягу 21 дня, кіраўнік USC сам павінен выбраць імя для вашага дзіцяці і зарэгістраваць яго нараджэнне.**

## Хто падае такую заяву?

Маці або бацька нованароджанага дзіцяці, якія маюць не менш за 16 гадоў і поўную праваздольнасць. У іншых сітуацыях гэта можа зрабіць законны прадстаўнік (напрыклад, адзін з бацькоў) або апякун маці.

## Якія дакументы трэба падрыхтаваць?

- пасведчанне асобы (пасведчанне асобы або пашпарт),
- калі вы вядзеце справу з дапамогай упаўнаважанага – падрыхтуйце даверанасць.

**Замежныя грамадзяне,** якія ўступілі ў шлюб за межамі Польшчы, пры рэгістрацыі дзіцяці прад'яўляюць арыгінал **пасведчання аб шлюбе разам з яго перакладам на польскую мову.** Незалежна ад сямейнага становішча бацькоў, якія з'яўляюцца замежнымі грамадзянамі, для таго, каб пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці змяшчала ўсе неабходныя даныя, трэба прад'явіць **пасведчання аб нараджэнні бацькоў разам з натарыяльным перакладам**. Няпоўнае пасведчанне можа быць дапоўнена ў будучым, аднак гэта звязана з аплатай пошліны.

**Бацька дзіцяці павінен загадзя падаць заяву аб прызнанні бацькоўства, калі ён не з'яўляецца мужам маці дзіцяці.** Толькі тады кіраўнік USC можа прыняць заяву аб нараджэнні ад бацькі і ўвесці яго даныя ў пасведчанне аб нараджэнні. Такую заяву бацька можа падаць:

- кіраўніку любога ЗАГСа (USC),
- консулу Рэспублікі Польшча (калі адзін з бацькоў мае польскае грамадзянства),
- суддзі.

Каб заява была сапраўднай, маці дзіцяці павінна пацвердзіць яе на працягу 3 месяцаў, лічачы з даты падачы дакументаў бацькам. У адваротным выпадку для прызнання пазашлюбнага дзіцяці неабходна прысутнасць абодвух бацькоў (для праверкі спатрэбяцца дакументы, якія сведчаць асобу, і перакладзеныя на польскую мову пасведчанні аб нараджэнні абодвух бацькоў).

## Як праходзіць працэс рэгістрацыі?

1. Кіраўнік USC падрыхтуе пратакол, які будзе змяшчаць даныя дзіцяці і бацькоў. Вы і кіраўнік USC падпішыце яго;
2. На падставе вашай заявы і пасведчання аб нараджэнні чыноўнік складзе пасведчанне аб нараджэнні;
3. Ён перадасць вам дакументы:
   - адну бясплатную скарочаную копію пасведчання аб нараджэнні **(звярніце ўвагу, што вам спатрэбіцца поўнае пасведчанне аб нараджэнні для наступных крокаў: прызнанне грамадзянства, легалізацыя знаходжання і інш.)**,
   - апавяшчэнне аб прадастаўленні нумара PESEL (калі дзіця атрымала яго),
   - пасведчанне аб рэгістрацыі дзіцяці (калі дзіця зарэгістраванае).

Выдача аднаго скарочанага пасведчання аб нараджэнні і рэгістрацыя дзіцяці бясплатныя. Калі вам трэба больш экземпляраў, вы павінны за іх заплаціць.

## Імя для дзіцяці

Няма фармалізаванага спісу імёнаў, якія вы можаце даць свайму дзіцяці, але ўлічвайце наступныя абмежаванні:

- нельга даваць дзіцяці больш за 2 імя,
- імя не можа быць насмешлівым або непрыстойным,
- імя не можа быць заяўлена ў памяншальнай форме.

**Вы можаце выбраць замежнае імя або імёны;** гэта можа быць імя, якое відавочна не ўказвае на пол, але звычайна прыпісваецца дадзенаму полу.
Калі імёны не адпавядаюць вышэй названым патрабаванням, кіраўнік USC можа адмовіцца прымаць выбраныя вамі імёны і самастойна выбраць імя дзіцяці.
У такім выпадку **ў вас ёсць 14 дзён, каб абскардзіць адміністрацыйнае рашэнне ваяводзе**. Апеляцыю перадайце кіраўніку USC, які вынес рашэнне.

## Участковая акушэрка

**Кожная мама і нованароджаны могуць і павінны ў рамках першаснай медыка-санітарнай дапамогі (POZ) карыстацца паслугамі папярэдне выбранай участковай акушэркі** (акушэркі POZ), якая да і пасля родаў ажыццяўляе акушэрскі і гінекалагічны нагляд за жанчынамі і нагляд за нованароджанымі да другога месяца жыцця.

Патранажны візіт акушэркі адбываецца пасля вяртання мамы з дзіцем з бальніцы дадому. Яшчэ падчас знаходжання ў бальніцы кожная мама павінна запоўніць заяву і вызначыць паліклініку, да якой яна хоча належаць з малым. **Бальніца адпраўляе заяву і карту вакцынацыі дзіцяці з бальніцы ў выбраную паліклініку**. Калі вы вернецеся дадому, вам проста трэба патэлефанаваць у паліклініку і выклікаць акушэрку.

Першы візіт акушэркі павінен адбыцца не пазней за 48 гадзін з моманту атрымання заявы - гэта значыць інфармацыі аб тым, што мама з дзіцем ужо дома. **Майце на ўвазе, што патранажны візіт з'яўляецца абавязковым і ад яго не варта адмаўляцца.**

Згодна з правіламі NFZ, **участковая акушэрка наведвае дзіцяці і маму ад 4 да 6 разоў на працягу першых 6 тыдняў пасля родаў.**

---

UNIA EUROPEJSKA
FUNDUSZ AZYLU,
MIGRACJI I INTEGRACJI

PFM
POLSKIE FORUM MIGRACYJNE

*Бяспечная гавань*
*(Bezpieczna przystań)*
Праект сумесна фінансуецца Нацыянальнай праграмай Фонду прытулку, міграцыі і інтэграцыі

Fundacja Polskie Forum Migracyjne
ul. Szpitalna 5/14, Warszawa
+48 692 913 993
info@forummigracyjne.org
**www.forummigracyjne.org**

Выключная адказнасць за выказаныя думкі ляжыць на аўтары, і Еўрапейская камісія, а таксама Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі не нясуць адказнасці за тое, як выкарыстоўваецца уступленая інфармацыя.